**20 год Гродзенскай  дыяцэзіі (44)**

Аўтар: Рэдакцыя
24.02.2013 01:00

2012 год

17 лістапада  -  У Смаргоні ксёндз біскуп асвяціў пляц пад будаўніцтва новай святыні пад тытулам бл. Яна Паўла II.

17 лістапада  - У Смаргоні адбыўся музычны фестываль “Цэцыліяда”. У ім прыняло ўдзел каля 60 чалавек.

25 лістапада  -  Парафіяне з Забалаці разам са сваім душпастарам дзякавалі за 200-годдзе святыні. Кс. бп Аляксандр адправіў св. Імшу падзякі.

† 25 лістапада - Адбылося 15-годдзе Душпастарства чыгуначнікаў. Урачыстую св. Імшу ў мікрараёне Дзевятоўка ў Гродне ўзначаліў кс. бп Аляксандр Кашкевіч.

26 лістапада - У Лідзе адбыўся І Чэмпіянат Беларусі па міні-футболе сярод святароў. Перамагла каманда ксяндзоў нашай дыяцэзіі.

30 лістапада – 1 снежня  - У Слоніме адбыўся VIII Турнір па міні-футболе імя Яна Паўла II.

2 снежня  -  Памерла с. Марыя Малгажата Забароўская CSFN.

7 снежня  -  Адбылася пілігрымка Душпастарства аховы здароўя ў Вільню разам з новым душпастарам кс. Мікалаем Ціхановічам.

8 снежня  -  У гродзенскай катэдры пастар дыяцэзіі ўдзяліў святарскія пасвячэнні дыякану Паўлу Аляскевічу і пасвячэнні дыяканату клерыкам: Юрыю Ясевічу, Яну Кузюку і Паўлу Эйсманту.

13 снежня  -  У Лаздунах вернікі маліліся за памерлага пробашча кс. Юзафа Рагіньскага ў сувязі з 15-й гадавінай яго смерці.

19 – 21 снежня -  З чарговым візітам Гродна наведаў Апостальскі нунцый. Ксёндз арцыбіскуп сустрэў Бэтлеемскі агонь у катэдры, а таксама прыняў удзел у аплаткавых сустрэчах у курыі і ў семінарыі.